**Дазвол на часовае пражыванне – на падставе працаўладкавання**

Вы можаце атрымаць дазвол на жыхарства ў Літве калі, адпавядаючы ўмовам выдачы дазволу, вы падасце належныя дакументы ў Дэпартамент міграцыі, калі літоўскі працадаўца пагадзіцца вас прыняць і аформіць на падставе працоўнага дагавора, а вы згодзіцеся з прапанаванымі ўмовамі працы, функцыямі, заработнай платай.

**Крокі вашага працаўладкавання ў Літве**

Для таго, каб пачаць працаваць, патрэбна мець дзеючы працоўны дагавор. Падпісваюцца два пісьмовыя экзэмпляры – адзін для вас і адзін для працадаўцы. Тэкст працоўнага дагавора загадзя падрыхтоўваецца – і на дзяржаўнай літоўскай мове, і на мове, зразумелай для вас. Будучы працадаўца абавязаны адказаць на ўсе вашыя пытанні адносна зместу дагавора.

Працадаўца падрабязна інфармуе работніка пра ўмовы працы і паводзіны на працоўным месцы, пра нормы бяспекі – адносна тэхнічнага абсталявання і здароўя людзей.

У працоўным дагаворы абавязкова пералічваюцца функцыі, якія вы будзеце выконваць, адрас месца працы і памер заработнай платы. Могуць быць прапісаныя і тэрміны выплаты заработнай платы.

Уважліва чытайце тэкст працоўнага дагавора – вельмі важна, каб вы ўсё зразумелі. Дарэчы, можаце ўдакладніць, якую мову зносінаў з вамі абірае працадаўца.

Не падпісвайце ніякіх дакументаў, калі ў вас узніклі сумневы адносна зместу дакументаў і вы не атрымалі адказаў на вашыя адпаведныя пытанні або адказы былі невыразнымі. Не падпісвайцеся на чыстым (без тэксту) лісце паперы, збоку ліста, таксама не ведаючы, які тэкст змешчаны вышэй. Не падпісвайце ніякія заявы, у якіх не прастаўленыя даты.

Пацвярджайце ўсе дамоўленасці з працадаўцам у пісьмовай форме – даказаць вусныя дамоўленасці ў выпадку спрэчкі практычна немагчыма.

Памятайце: працоўны дагавор уступае ў сілу з моманту пачатку вашай працы.

Пра вашае працаўладкаванне працадаўца павінен паведаміць у Упраўленне фонду дзяржаўнага сацыяльнага страхавання (SODRA) не пазней чым за адзін працоўны дзень да пачатку працы. Гэтае паведамленне гарантуе, што вы будзеце працаваць легальна і што за вас будуць плаціць падаткі, а калі ўзнікне няшчасны выпадак на працы або хвароба, вам будзе налічаная адпаведная грашовая выплата.

**Аплата працы**

У працоўны дагавор абавязкова запісваецца плата за месяц працы (памесячная заработная плата) альбо плата за 1 гадзіну працы (пагадзінная плата) – не менш за той мінімальны памер, які быў зацверджаны Урадам Літоўскай Рэспублікі.

Мінімальная заработная плата ў Літве перыядычна мяняецца, змены паказваюцца на сайце Упраўлення фонду дзяржаўнага сацыяльнага страхавання SODRA: https://www.sodra.lt/lt/situacijos/statistika/pagrindiniai-socialiniai-rodikliai

Мінімальная плата выплачваецца толькі за працу, што не патрабуе спецыяльных прафесійных уменняў. За высокакваліфікаваную працу належыць вышэйшая заработная плата.

У дагавор з працадаўцам таксама могуць быць уключаныя пагадненні аб прэміях, надбаўках ці дадатковых кампенсацыях – з улікам розных сістэмаў аплаты працы. Аплата вашай працы не можа быць меншай, чым у работніка, які выконвае тую ж працу ў таго ж самага наймальніка.

За працу ў выходны дзень, які не ўключаны ў ваш працоўны графік, вам належыць падвойная аплата. Тое ж датычыцца і працы ў святочныя дні.

Не менш чым адзін раз у месяц працадаўца павінен у пісьмовай або электроннай форме прадастаўляць вам інфармацыю пра налічаныя, выплачаныя і ўтрыманыя грашовыя сумы, таксама пра колькасць працоўных гадзінаў, у тым ліку звышурочных.

Па правілах заработная плата выплачваецца два разы ў месяц. Па просьбе работніка заработная плата можа быць выплачаная і адзін раз у месяц.

Заработная плата і іншыя выплаты, а таксама кампенсацыя камандзіровачных выдаткаў будуць пералічвацца на ўказаны вамі разліковы рахунак.

**Гадзіны працы**

Працадаўца павінен працаўладкаваць вас на поўную стаўку, гэта 40 гадзінаў на тыдзень. Гадзіны працы паказваюцца ў вашым дагаворы. Дакладна вызначаецца графік працы, з размеркаваннем працоўнага часу.

Працягласць працы за адзін дзень, уключаючы звышурочную, не можа перавышаць 12 гадзінаў.

На працягу 7 дзён вы не павінны працаваць больш чым 6 дзён запар.

Працягласць штодзённага бесперапыннага адпачынку паміж працоўнымі днямі (зменамі) не можа быць меншай за 11 гадзінаў запар, а на працягу 7 дзён запар вы павінны мець не менш за 35 гадзінаў бесперапыннага адпачынку.

Звышурочная праца не можа перавышаць 12 гадзінаў за адзін тыдзень. Акрамя выключных выпадкаў працадаўца можа прызначыць звышурочную працу толькі з вашай згоды.

За звышурочную працу вам належыць аплата ў 1,5 раза большая, чым па працоўным дагаворы за той жа перыяд часу.
У 1,5 раза большая плата таксама налічваецца за працу ўначы, г.зн. з 22.00 да 6.00 гадз.

**Працоўны адпачынак**

Пасля 6 месяцаў бесперапыннай працы на адным працоўным месцы вы маеце права на штогадовы водпуск, які аплачваецца працадаўцам.

Пасля гэтага вам павінны прадастаўляць штогадовы водпуск не радзей аднаго разу за працоўны год.

Аплата за штогадовы водпуск павінна быць выкананая не пазней чым за 3 працоўныя дні да пачатку водпуску, калі іншае не ўзгоднена.

**Праца на некалькіх наймальнікаў**

Вы можаце адначасова працаваць не больш чым у 4 працадаўцаў, якія ўсе фіксуюцца ў адным працоўным дагаворы. Агульная працягласць працы не можа перавышаць 40 гадзінаў за адзін тыдзень. У згаданым дагаворы абавязкова адзначаецца першы наймальнік – як ваш пасрэднік у Дэпартаменце міграцыі.

**Змена працадаўцы**

Калі вы вырашыце змяніць месца працы або працоўную функцыю, патрабуецца дазвол Дэпартамента міграцыі. Змяніць працадаўцу вы можаце толькі праз 6 месяцаў (пасля выдачы дазволу на жыхарства). Хадайніцтва аб змене вы абавязаныя падаць у Дэпартамента міграцыі пакуль яшчэ працуеце на свайго наймальніка.

Можа так здарыцца, што падчас разгляду вашай просьбы аб дазволе змяніць працадаўцу, ваш дагавор будзе скасаваны. Аднак не будзе ануляваны дазвол на жыхарства, а разгляд вашай просьбы будзе працягвацца.

У тым выпадку, калі Дэпартамент міграцыі дазволіць вам змяніць працадаўцу, ваш дазвол жыхарства застанецца дзеючым нават калі вы ўладкуецеся на працу да іншага працадаўцы.

Хадайніцтва аб змене працадаўцы або працоўнай функцыі разглядаецца 1 месяц, і тэрмін дзеяння рашэння Дэпартамента міграцыі аб змене наймальніка або працоўнай функцыі – 1 месяц.

**Дзяржпошліны**

За падачу заявы ў Дэпартамент міграцыі з наступным разглядам і прыняццем рашэння спаганяецца плата, устаноўленая дзяржавай.

За прыняцце і разгляд хадайніцтва аб атрыманні дазволу на часовае пражыванне і выдачу/нявыдачу дазволу за 3 месяцы, у агульным парадку – 160 EUR.

За прыняцце, разгляд хадайніцтва аб атрыманні дазволу на часовае пражыванне і выдачу/нявыдачу дазволу на працягу 45 дзён, у тэрміновым парадку – 320 EUR.

Калі вы жадаеце падоўжыць сваю працу ў Літве, неабходна прадоўжыць (змяніць) тэрмін дзеяння дазволу на часовае пражыванне (змяніць дазвол). Для гэтага падаецца заяўка праз літоўскую сістэму міграцыйнай інфармацыі MIGRIS: www.migracija.lt

Падаць запыт аб змене дазволу на часовае пражыванне ў Літве можна, калі да заканчэння тэрміну яго дзеяння засталося не больш як 6 месяцаў.

Вашая заяўка аб змене дазволу можа быць разгледжаная ў агульным парадку на працягу 2 месяцаў, дзяржпошліна складае 160 EUR.

За апрацоўку такога запыту ў тэрміновым парадку на працягу 1 месяца, за гэта спаганяецца 320 EUR.

За разгляд і прыняцце рашэння па хадайніцтве аб змене працадаўцы спаганяецца 100 EUR.

**Што важна ведаць, калі вы маеце намер працаваць кіроўцам, які перавозіць тавары або пасажыраў у камерцыйных мэтах**

Калі вы плануеце працаваць у літоўскай кампаніі кіроўцам, які перавозіць тавары або пасажыраў у камерцыйных мэтах (дзе вам неабходна мець вадзіцельскае пасведчанне катэгорыі C1, C1E, C, CE, D1, D1E, D або DE), вам спатрэбіцца:

- прайсці прафесійную падрыхтоўку кіроўцаў у ліцэнзаванай навучальнай установе і атрымаць кваліфікацыю або пасведчанне аб перыядычным павышэнні прафесійнай кваліфікацыі;
- пасля атрымання гэтага пасведчання звярніцеся ў AB «Regitra» для ўнясення кваліфікацыйнага кода «95» пры замене вадзіцельскага пасведчання або выдачы кваліфікацыйнай карты кіроўцы (калі пасведчанне не можа быць заменена). Каб наведаць аддзел, неабходна загадзя зарэгістравацца на сайце www.regitra.lt.

Больш падрабязную інфармацыю пра замену вадзіцельскіх правоў і выдачу кваліфікацыйных картак кіроўцы можна знайсці на сайце www.regitra.lt

**Іншая важная інфармацыя**

Калі Дэпартамент міграцыі выявіць, што ваш працадаўца:
• прадставіў у Дэпартамент міграцыі непраўдзівыя звесткі, незаконна атрыманыя або падробленыя дакументы; або
• працадаўца–агенцтва часовага працаўладкавання выключаны са спісу арганізацыяў часовага працаўладкавання, які складае Дзяржінспекцыя працы і публікуе на сваім сайце; або
• быў пакараны за дазвол на нелегальную працу, недэклараваную працу або парушэнне парадку працаўладкавання замежнікаў згодна з палажэннямі Закона аб занятасці і не прайшло аднаго года з даты выплаты штрафу або выканання абавязацельстваў,

вам будзе высланае паведамленне пра тое, што, калі вы не зменіце працадаўцу на працягу 3 месяцаў, ваш від на жыхарства будзе ануляваны.

Атрымаўшы такое паведамленне, вам давядзецца выбіраць:
– на працягу 3 месяцаў скасаваць працоўны дагавор з працадаўцам і пакінуць Літву, або
– на працягу 3 месяцаў знайсці ў Літве іншага працадаўцу, які пагодзіцца пасярэднічаць ад вашага імя ў Дэпартаменце міграцыі, і падаць запыт аб дазволе на змену працадаўцы.

Калі вы камандзіраваныя за мяжу, вашае знаходжанне ў іншай краіне Еўрапейскага саюза або Шэнгенскай зоны не можа перавышаць 90 дзён на працягу 180 дзён.

**Фінал працы і ад'езд з Літвы**

У выпадку, калі вашыя працоўныя адносіны з працадаўцам скасаваныя і вы не падалі запыт аб дазволе на змену працадаўцы або сваёй працоўнай функцыі, вы павінны пакінуць Літоўскую Рэспубліку.

Атрымаўшы паведамленне Дэпартамента міграцыі пра ануляванне дазволу на часовае пражыванне, вы павінны пакінуць Літву на працягу 14 дзён.

Калі вы не пакінеце Літву ў вызначаны тэрмін, будзе прынятае рашэнне аб дэпартацыі або высылцы.

Ануляваны дазвол на жыхарства вы абавязаныя вярнуць у Дэпартамент міграцыі.

**Формы эксплуатацыі**

У выпадку эксплуатацыі ў працоўнай сферы неадкладна звяртайцеся па кантактах, прыведзенымі ніжэй, калі вы лічыце, што сталі аб'ектам эксплуатацыі і вас прымушаюць:

- працаваць у асабліва цяжкіх/рабскіх ці іншых бесчалавечных умовах;
- працаваць больш, чым прадугледжана працоўным дагаворам, калі працадаўца прымушае працаваць звышурочна без дадатковай аплаты, адмяняе перапынкі;
- змірацца і трываць невыкананне парадку працы і адпачынку;
- працаваць за заработную плату, меншую чым тая, што ўстаноўленая і запісаная ў працоўным дагаворы, або без атрымання абавязковых выплат, калі яны прадугледжаныя дагаворам;
- падпісваць дакументы, змест якіх наймальнік не растлумачыў і не дазволіў азнаёміцца, сфатаграфаваць, не дае копію і інш.;
- падпісаць заяву на адпачынак без захавання заработнай платы. Памятайце, што працадаўца не можа прымусіць вас падпісаць такое патрабаванне.

Калі наймальнік абмяжоўвае свабоду перамяшчэння, адбірае ў вас дакументы, пагражае фізічнай або псіхалагічнай расправай, не дае магчымасці пакінуць працу, вы можаце быць прызнаныя ахвярай прымусовай працы або гандлю людзьмі. Калі пракурор, які расследуе вашую справу, прызнае вас пацярпелым, вы можаце звярнуцца ў Дэпартамент міграцыі з просьбай аб выдачы дазволу на часовае пражыванне ў якасці ахвяры гандлю людзьмі або нелегальнай працы. У гэтым выпадку часовы дазвол на жыхарства будзе выдадзены на 6 месяцаў.

**Кантакты для дапамогі**

| | |
|---|---|
| Агульны нумар экстраннай дапамогі – 112 (24/7)<br><br>Па пытаннях, звязаных с міграцыяй:<br>Дэпартамент міграцыі<br>+370 707 67 000<br>info@migracija.gov.lt<br><br>Паведаміць пра парушэнні працоўнага распарадку, правоў як работніка:<br>Кансультацыі па пытаннях працоўнага дагавора:<br>Дзяржаўная інспекцыя працы<br>+370 5 213 9772 (націсніце 1)<br>info@vdi.lt | Ананімна паведаміць пра такія магчымыя парушэнні на працы, як неналежныя ўмовы працы, злоўжыванне працоўным часам і адпачынкам, адсутнасць працоўнага дагавора:<br>Дзяржаўная інспекцыя працы<br>+370 5 213 9772 (націсніце 2)<br>info@vdi.lt<br><br>Калі ёсць падазрэнне, што вы сталі або рызыкуеце стаць ахвярай гандлю людзьмі:<br>Дапамога ахвярам гандлю людзьмі<br>+370 616 91 119<br>info@stop-trafficking.lt<br><br>Цэнтр супрацьдзеяння гандлю людзьмі і эксплуатацыі<br>+370 679 61617<br>info@anti-trafficking.lt |